**Вольга Мась**
(Гародня)

## Роля сядзібаў у развіцці культуры Заходняй Беларусі ў 1921–1939 гг. (па матэрыялах Навагрудскага ваяводства)

На тэрыторыі Заходняй Беларусі да сённяшніх дзён захавалася значная колькасць палацава-паркавых комплексаў. Іх тыпалогія даволі шырокая: ад невялікай і сціплай сядзібы да манументальнага палацава-паркавага ансамбля. Усе яны складаюць значную частку той культурнай высокамастацкай спадчыны, што засталася нам ад продкаў. І за кожным з іх свая гісторыя, канкрэтныя людзі, іх індывідуальныя лёсы. Таму вельмі важным для даследавання культуры Беларусі з'яўляецца разуменне ўнутранага жыцця палацава-паркавых комплексаў, духоўнай дзейнасці іх уладальнікаў. Тым больш актуальнай уяўляецца праблема жыцця палацаў у такі супярэчлівы перыяд беларускай гісторыі, як 20-30-ыя гг. XX ст.

Культура сядзібаў фармавалася ў рэчышчы агульных культурна-гістарычных працэсаў, якія адбываліся ў 20-30-х гг. у Заходняй Беларусі. На іх развіццё аказвалі ўплыў шматлікія фактары: нацыянальныя, палітычныя, эканамічныя, геаграфічныя. Культура тут заставалася адзінай у сваёй духоўнай адметнасці прасторай, здольнай зберагчы пераемнасць развіцця, ствараць асяродкі мастацкага жыцця, якімі і з'яўляліся палацавыя комплексы. Фармаванне культуры гэтага рэгіёна адлюстроўвае асаблівасці светаадчування мясцовага насельніцтва і разам

з тым агульныя тэндэнцыі развіцця еўрапейскай культуры таго часу.

У XIX ст. шляхецкая культура паступова траціць дамінуючую пазіцыю, перастае выконваць ролю агульнадзяржаўнай культуры. Аднак яна і далей захоўвала вялікую прыцягальную сілу, ператвараючыся ў культуру шляхецка-інтэлігенцкую. Выразнікамі шляхецкіх традыцый у часы ІІ Рэчы Паспалітай былі землеўладальнікі. Таму шляхта, прадстаўленая імі, навязвала свой спосаб паводзінаў, мадэль грамадскіх адносінаў, а таксама і стыль жыцця, якія паступова быў прыняты ўсёй інтэлігенцыяй[1].

Памятаючы дыскусіі аб паходжанні інтэлігенцыі, трэба сцвердзіць, што разам з набыццём самакаштоўнасці і інтэнсіўным развіццём гэты слой грамадства становіцца ў штораз большай ступені творцам дзяржаўнай культуры. Працягваючы многія шляхецкія традыцыі і захоўваючы іх, інтэлігенцыя ўводзіла і шмат новых. Культура землеўладальнікаў застаючыся, па сутнасці, культурай вышэйшых слаёў, у XX ст. мусіла ўсё больш саступаць культуры масавай. Аднак шляхецтва заўсёды імпанавала вялікай частцы інтэлігенцыі і асабліва дробнаму мяшчанству[2].

Увогуле пераймаліся розныя элементы шляхецкай культуры. З успамінаў бачна, што ў тыя часы родавыя тытулы яшчэ зіхацелі поўным бляскам і мелі вялікае грамадскае значэнне. Землеўладальнікі і арыстакратыя адыгрывалі ў ІІ Рэчы Паспалітай даволі важную ролю. Хоць яны былі нязначнай часткай грамадства, але сем'і, што былі з імі ў сваяцкіх адносінах, або звязаныя нейкім іншым чынам, складалі даволі вялікую і бадай самую ўплывовую ў большасці сфер жыцця групу, і таму спосаб іх светаадчування аказвае ў ІІ Рэчы Паспалітай усё большы ўплыў на грамадства[3]. Землеўладальнікі сярод палітычнай эліты ўмелі ўцягнуць прадстаўнікоў улады ў разнабаковае свецкае жыццё. Для гэтага як мага лепей падыходзілі салоны і паляванні, дзе сустракаліся палітыкі і дыпламаты і дзе не раз вырашаліся важныя справы. Але трэба адзначыць, што ў XX ст. паляванні паступова страчваюць сваё гаспадарчае значэнне, ператвараючыся хутчэй у традыцыйную ўцеху, нават рытуал.

[1] S. Rudnicki, *Ziemiaństwo polskie w XX wieku*, Warszawa 1996, s. 136.
[2] Там жа.
[3] W. Grabski, *Idea Polski*, Warszawa 1935.

Палацы і маёнткі ўспрымаліся як пэўныя сімвалы быцця землеўладальнікаў, выразнікі іх матэрыяльнага дастатку, якія сведчылі аб іх грамадскім статусе. Маёнтак уяўляўся ўлюбёным кутком, цесна звязаным з сямейнымі традыцыямі і паданнямі. Як перад I Сусветнай вайной, так і ў перыяд II Рэчы Паспалітай, адбудаваныя, перабудаваныя і будаваныя нанова дамы вобразна звярталіся да мінулага, да так званага нацыянальнага стылю, які быў рэмінісцэнцыяй барока і класіцызму. Гэта быў яшчэ адзін элемент, што працягваў і нават кансерваваў былыя традыцыі.

Як і перад I Сусветнай вайной, большасць двароў магла толькі марыць аб электрычнасці. Вечарамі карысталіся часцей газавымі лямпамі. Не было таксама водаправодаў і каналізацыі. Камунікацыі і святло залежалі ад адлегласці да чыгуначнай станцыі. Пошта звычайна была даволі аддаленай. Раз у некалькі дзён туды адпраўлялі пасланца па лісты і газеты. Таму большасць звестак прыходзіла са спазненнем. Толькі тэлефон і аўтамабіль зрабілі магчымым больш сціслы кантакт са светам, але стан дарог дазваляў карыстацца аўтамабілем толькі летам. Гэтыя два дасягненні тэхнікі з'явіліся ў маёнтках за некалькі год да I Сусветнай вайны і яшчэ доўга лічба іх уладальнікаў заставалася невялікай.

Трэба адзначыць, што наколькі розніўся маёмасны стан землеўладальнікаў, настолькі розніліся і іх імкненні і зацікаўленні. Шырока распаўсюджанай была цікавасць да гісторыі і генеалогіі, што было цесна звязана з каштоўнасцю інстытута сям'і. Збіралі сямейныя рэліквіі і дакументы, у мастацтве цікавасць выклікаў партрэт, бо збіралі сямейныя партрэты. Часам збіральніцтва ператваралася ў сапраўднае калекцыянаванне, якое ўключала розныя віды мастацтва, у тым ліку і прыкладное. Цаніліся старая мэбля, парцаляна, срэбра, зброя і г.д. Сустракаліся і такія рэдкія калекцыі, як калекцыя экзатычных матылёў, якую на працягу ўсяго жыцця збіраў апошні гаспадар Чомбрава Караль Карповіч[4]. Захапленне збіральніцтвам і калекцыянаваннем прыводзіла да ўзнікнення шэрагу прыватных калекцый, якія часам маглі параўноўвацца з добрым музеем. Так, у маёнтку Нача Лідскага павета, якім валодаў вядомы археолаг, антраполаг, краязнавец і этнограф Вандалін Шукевіч, захоўвалася выдатная калекцыя археалагічных знаходак, а таксама рукапісы, навуковыя матэ-

[4] Z. Brzozowska, *Impresje czombrowskie*, Bydgoszcz 1997, s. 111.

рыялы самога В. Шукевіча[5]. У большасці палацаў меліся бібліятэкі і архівы. Некаторыя кнігазборы налічвалі тысячы і нават дзесяткі тысяч тамоў. Тут побач з мясцовымі выданнямі можна было сустрэць вялікую колькасць твораў замежных аўтараў. Паводле сваёй тэматыкі кніжныя зборы былі вельмі разнастайнымі. У іх уваходзіла інтымная лірыка, гуманістычныя і сатырычныя творы, панегірыкі, эпітафіі, сямейныя дакументы, а таксама філасофская, прыгодніцкая і гістарычная літаратура. Напрыклад, у бібліятэцы Бохвіцаў у маёнтку Фларыянаў захоўваўся рэдкі збор польскіх перыядычных выданняў (у некаторых выпадках у адзіным экземпляры), якія выходзілі па ўсім свеце[6]. У палацы графаў Умястоўскіх у Жамыславе захоўвалася багатая бібліятэка, якая ў большасці складалася са старадрукаў і рэдкіх кніг[7].

Амаль не змяніліся традыцыі і ў выхаванні дзяцей. Перад імі ставіліся вялікія патрабаванні. Пачатковую адукацыю дзеці атрымоўвалі дома, для чаго наймалі настаўнікаў. Вялікую ўвагу надавалі вывучэнню замежных моў. Гэта было нязменным элементам выхавання дзяцей. У больш багатых дамах дзеля навучання замежным мовам выпісвалі бонаў, гувернантак ці настаўніц з-за мяжы. Па атрыманні хатняй адукацыі дзяцей пасылалі ў школу. Заможныя сем'і часам адсылалі дзяцей на вучобу за мяжу, каб пазбегнуць уплыву айчыннай школы. Калі ж навучанне адбывалася на месцы, то выбіраліся лепшыя школы і гімназіі. Мяркуючы па ўспамінах, у Навагрудскім ваяводстве гэта былі школы і гімназіі ў Вільні і Навагрудку[8]. Вышэйшую адукацыю імкнуліся атрымаць пераважна за мяжой. Падчас вучобы змянялі універсітэты і прадметы навучання, і не заўсёды яно заканчвалася атрыманнем дыплома.

Існавала пытанне, што вывучаць. Натуральна, значная частка моладзі ішла вывучаць сельскую гаспадарку. Аднак гэта адукацыя не была паўсюднай. Дзеці землеўладальнікаў вучыліся таксама і ў іншых установах. За прэстыжную прафесію для хлопцаў, акрамя сельскай гаспадаркі, лічылі права. Нягледзячы на тое, што іншыя прафесіі, як напрыклад інжынерныя і медыцынскія,

[5] E. Chwalewik, *Zbiory polskie*, Warszawa – Kraków 1926, t. 2, s. 559; *Археалогія і нумізматыка Беларусі: Энцыклапедыя*, Мінск 1993, с. 702.

[6] E. Chwalewik, *Zbiory polskie*, t. 1, s. 490.

[7] R. Afftonazy, *Dzieje rezydencji na dawnych kresach Rzeczypospolitej*, t. 3, Warszawa 1984.

[8] Z. Brzozowska, *Impresje czombrowskie*, s. 111; K. Iwanowski, *Wspomnienia z kresowej młodości*, Bydgoszcz 1995, s. 136.

не былі такімі папулярнымі, з цягам часу разуменне таго, што не ўсе могуць застацца на зямлі, зменшала непрыязнасць да апошніх. Вышэйшыя навучальныя ўстановы заканчвала меншасць землеўладальнікаў, хаця пастулова працэнт людзей з вышэйшай адукацыяй узрастаў.

Акрамя прэстыжных прафесій, існавалі таксама і прэстыжныя ўстановы. Моладзь імкнулася атрымаць працу ў міністэрствах і ўрадах, як, напрыклад, Казімір Чарноцкі з маёнтка Ляцешын Нясвіжскага павета, які працаваў у Міністэрстве сельскай гаспадаркі (Instytut Badań Koniunktur i Cen)[9]; і вельмі малая частка ішла ў прамысловасць. Даводзілася займаць дыпламатычныя пасады альбо быць кадравым вайскоўцам. У дыпламатыі было карысным веданне некалькіх замежных моў (патрабавалася беглае валоданне трыма мовамі). Часта ў атрыманні дыпламатычнай службы дапамагалі міжнародныя кантакты сям'і і асяроддзя. Пры адбыванні вайсковай службы добрым тонам лічылася служба ў кавалерыі або коннай артылерыі.

Шмат часу прысвячалі землеўладальнікі грамадскай працы ў навакольных вёсках і сярод сваіх сялян. Так у 1912 г. у мястэчку Беняконі браты Раман і Эдвард Рымшы і Ваўжынец Путкамер на свае грошы ўтварылі сельскагасрадарчую вопытную станцыю, якой кіраваў вядомы беларускі навуковец Вацлаў Ластоўскі. Гэта станцыя паспяхова дзейнічала да 1939 года[10]. Архіўныя даныя сведчаць, што ў міжваеннае дваццацігоддзе быў заснаваны так званы сельскагаспадарчы інстытут у маёнтку Ганусоўшчына Нясвіжскага павета і сельскагаспадарчая школа ў маёнтку Лаздуны Валожынскага павета. У склад апошняга па даных архіва ўваходзіла: 97 га ворнай зямлі, палёў і саду, мураваны палац, два мураваныя дамы, гумно, мураваная абора, лядоўня, піўніца – усё ў добрым стане[11]. Шмат увагі надавалася кіраўніцтву дзіцячымі прытулкамі і барацьбе з неадукаванасцю. У многіх маёнтках уладальнікі за свой кошт, як, напрыклад, у Гурыноўшчыне Рымшаў, засноўвалі школы для навакольных дзяцей[12]. Працавалі таксама над павышэннем гаспадарчай і асабістай культуры сялян.

Землеўладальнікі разам з прамыслоўцамі былі той групай, якая мела грошы і магла выступаць у якасці мецэнатаў. Шчод-

[9] *Ziemianie polscy XX wieku. Słownik biograficzny*, t. I, Warszawa 1994.

[10] Там жа, т. 2.

[11] Дзяржаўны архіў Гродзенскай вобласці, фонд 551, вопіс 1, справа 2511; там жа, справа 2427.

[12] *Ziemianie polscy XX wieku. Słownik biograficzny*, t. II.

расць іх не раз распаўсюджвалася і на ўстановы культуры. Многія перадавалі свае каштоўныя калекцыі дзяржаўным музеям, дапамагалі навуцы. Мецэнацтва прымала разнастайныя формы, але самай трывалай былі фундаванні ад асобных людзей або ўсёй сям'і. Вялікія заслугі ў гэтым накірунку мелі земдеўладальнікі Заходняй Беларусі. Напрыклад, толькі па Віленскай школьнай акрузе выдаткі на стыпендыі перад I Сусветнай вайной склалі 1,5 мільёна рублёў золатам, з якіх палову складалі ахвяраванні землеўладальнікаў. На свае грошы мецэнаты будавалі бібліятэкі, дапамагалі навуковым таварыствам, школам, музеям[13].

Землеўладальнікі, у межах сваіх тагачасных магчымасцяў, працягвалі традыцыі мецэнацтва і ў II Рэчы Паспалітай. Найбольш вядомай фундацыяй таго часу на нашых землях з'яўляецца заснаваная ў 1922 г. графіняй Умястоўскай Навуковая фундыцыя імя Уладзіслава і Яніны графаў Умястоўскіх, на карысць якой яна перадала ўсе фальваркі маёнтка Жамыслаў[14]. Фальварак Клевіцы служыў для сельскагаспадарчых мэтаў Універсітэта Стэфана Баторыя. Фундатарка ахвяравала на гэтыя мэты 2 200 га і значную суму наяўнымі, дзякуючы чаму Урад Фундацыі адбудаваў вінакурню, якая выпускала да 7 000 літраў спірту штогод, набыў стайню коней, меў магчымасць займацца гадоўляй авечак, развядзеннем быдла польскай чырвонай расы, свіней, і прыступіў да пабудовы вялікага драўлянага будынка, прызначанага для практыкі сельскагаспадарчай акадэмічнай моладзі Універсітэта Стэфана Баторыя. На працягу некалькіх гадоў Жамыслаўская Фундацыя атрымоўвала шэраг медалёў і дыпломаў на айчынных выставах за высокі ўзровень гадоўлі і гаспадаркі.

У фальварку Канвалішкі пані Умястоўская за ўласны кошт пабудавала дом адпачынку для навукоўцаў, літаратараў і мастакоў, урачыстае адкрыццё якога адбылося 14 жніўня 1938 г. На першай старонцы памятнай кнігі яна напісала: „Шчаслівая тым, што яшчэ пры жыцці магла ажыццявіць ідэю стварэння дому адпачынку для навукоўцаў, мастакоў і літаратараў, гэта значыць для тых, аб кім можа найменш клапоціца наша грамадства. Перадаю дом гэты Ураду Фундацыі, спадзяюся, што прыгажосць дарагога мне Жамыслава дасць ім адпачынак і натхненне".

Праз дасканалае абсталяванне дому фундатарка стварыла ідэальныя ўмовы для працы і адпачынку прадстаўнікоў творчай

[13] H. Korwin-Milewski, *Siedemdziesiąt lat wspomnień*, Poznań 1930, s. 600.
[14] Nałęcz, *Szmat ziemi i życia*, Wilno 1928, s. 227.

інтэлігенцыі. Дом налічваў 7 пакояў для гасцей. Меў вялікі з густам мэбляваны хол з мяккімі крэсламі і фартэпіяна, а таксама агульны сталовы пакой. Далей – кухня, ванны і іншыя службовыя памяшканні. Кожны пакой быў абсталяваны падвойнымі дзвярыма, на вокнах цяжкія парцьеры, на падлозе дыван, стыльны пісьмовы стол з прыборамі, мяккае крэсла, шафа з вялікім люстэркам, круглы столік, нікеляваны ложак, практычны тапчан, каб днём было на чым паляжаць. Акрамя гэтага, стыльная начная шафа, практычная лямпа з абажурам. І канечне званок для слугі. Літаратар меў ідэальныя ўмовы для працы ў пакоі, кампазітар мог займацца пры фартэпіяна, а мастак меў майстэрню ў палацавай вежы, з якой адкрываліся казачныя краявіды. Трэба зазначыць, што згодна волі фундатаркі домам маглі карыстацца толькі мужчыны. Найбольшы час побыту 3 тыдні. Кошт: 2 злотых 5 грошаў штодня. Карыстацца мог любы літаратар, мастак, навуковец, пры папярэднім паданні, якое дасылалі ва Урад Фундацыі[15].

Некаторыя з маёнткаў належалі вядомым палітычным дзеячам таго часу і дзеячам культуры: літаратарам, мастакам, навукоўцам. Паколькі гэта былі людзі творчыя, у іх сядзібах даволі часта адбываліся розныя імпрэзы: балі, канцэрты, літаратурныя вечарыны, на якіх збіраліся лепшыя прадстаўнікі грамадства. Выдатным прыкладам з'яўляюцца музычна-літаратурныя вечары ў маёнтку Фларыянаў Тадэвуша Бохвіца, на якіх чыталіся яшчэ невыдадзеныя творы, дэкламаваліся вершы. Бывалі на гэтых імпрэзах вядомы пісьменнік, лаўрэат Нобелеўскай прэміі Уладзіслаў Рэймант, знакаміты польскі акцёр, рэжысёр, дырэктар Кракаўскага і Варшаўскага тэатраў Юзаф Катарбінскі і інш.[16] Шмат знакамітых дзеячаў навукі і культуры таго часу збіралася і ў маёнтку Багданаў вядомага мастака Фердынанда Рушчыца, з якім сябраваў класік польскай і беларускай мастацкай фатаграфіі Ян Булгак. У сваіх успамінах Я. Булгак згадвае Багданаў як сапраўдны ўзор шляхецкай сядзібы, як найпрыгажэйшы прыклад сямейнага гнязда. „Дом меў рысы патрыярхальнасці і сапраўднай старапольскай гасціннасці. Ён быў непрыкметны, сціплы, але прасторны, разлічаны на выгодны адпачынак вялікай сям'і, родных і гасцей, далёкі ад гарадской шыкоўнай цеснаты і таннай элегантнасці. Дом жыў стагоддзямі,

[15] „Ziemia Nasza" Miesięcznik krajoznawczo-regionalny, Lida, nr 10, 1938, s. 121–124.

[16] *Ziemianie polscy XX wieku. Słownik biograficzny*, t. III.

фармаваўся чаргаваннем чалавечых жыццяў, убіраў іх душы, узбагачаўся набыткамі іх працы і памяткамі іх лёсу, упраўляўся на іх лад і адчуванне так клапатліва, што станавіўся патрэбным як паветра ў жыцці яго жыхароў, часткай іх уласнага існавання"[17]. Гэтыя словы Я. Булгака могуць быць характарыстыкай жыцця землеўладальнікаў амаль кожнай сядзібы Навагрудскага ваяводства ў міжваенны перыяд.

[17] J. Bułhak, *Wiek męski Ferdynanda Ruszczyca*, [w:] *Ferdynand Ruszczyc. Życie i dzieło: Księga zbiorowa*, Wilno 1939, s. 47–326.